УДК 63(476)(091) «1943/1991»

# СЕЛЬСКАЯ ГАСПАДАРКА БЕЛАРУСІ Ў 1943–1991 гг.: ВЫНІКІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ ДАСЛЕДАВАННЯ

**Смяховіч Мікалай Уладзіміравіч**
кандыдат гістарычных навук, дацэнт,
загадчык Цэнтра новай і навейшай гісторыі Беларусі
Інстытута гісторыі НАН Беларусі
(г. Мінск, Беларусь)

Неабходна адзначыць, што за перыяд з 1943 па 2015 гг. у айчыннай гістарыяграфіі не было створана абагульняючай працы па гісторыі развіцця сельскай гаспадаркі Беларусі ў 1943-1991 гг. [1, с. 40–51; 2, с. 175–186]. Разам з тым шматгадовае даследаванне аўтарам артыкула аграрнай палітыкі КПСС-КПБ, кірункаў і этапаў развіцця матэрыяльнай базы калгасна-саўгаснай вытворчасці, працэсу спецыялізацыі і канцэнтрацыі раслінаводства і жывёлагадоўлі, пытання арганізацыі працы і забеспячэння сельскай гаспадаркі кіруючымі кадрамі, дыпламаванымі спецыялістамі, механізатарскімі кадрамі, кірункаў рэфармавання аграрнай вытворчасці пад час перабудовы (і інш.) дазволіла атрымаць пэўныя вынікі і дало магчымасць прыйсці да высновы аб тым, што:

1. Практычная дзейнасць партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва СССР і БССР па вырашэнні аграрнага пытання, задавальненні спажывецкага попыту на харчовыя тавары, забеспячэнні інтарэсаў сялянства прыпала на чатыры перыяды. Першы перыяд ахапіў верасень 1943 г. – жнівень 1953 г., другі – верасень 1953 г. – 1961 г., трэці – 1962–1985 гг., чацвёрты – 1986–1991 гг.

У СССР і БССР першы перыяд характарызаваўся палітыкай, скіраванай на аднаўленне і ўздым сельскай гаспадаркі, разбуранай пад час Вялікай Айчыннай вайны і акупацыі. Асаблівасцю аграрнай палітыкі ў 1946–1948 гг. у заходніх абласцях БССР была прапаганда ідэі вытворчай сялянскай кааперацыі, стварэнне калгасных гаспадарак, заснаваных на прынцыпах добраахвотнасці. Пад час масавай калектывізацыі сельскай гаспадаркі ў заходніх абласцях Беларусі аграрная палітыка дзяржавы супярэчыла інтарэсам сялянства, пераважаў яе мабілізацыйна-прымусовы кірунак па прыцягненні сялян у калгасы. Вынікам калектывізацыі сельскай гаспадаркі заходніх абласцей было ўсталяванне каманднa-адміністрацыйнай сістэмы на ўсёй тэрыторыі Беларусі [3, с. 128–133].

У другі перыяд аграрная палітыка дзяржавы ў СССР і БССР была скіравана на круты ўздым сельскай гаспадаркі, задавальненне спажывецкага попыту на харчовыя тавары. Аднак ва ўмовах умацавання каманднa-адміністрацыйнай сістэмы, перавагі мабілізацыйна-прымусовых формаў арганізацыі і аплаты працы сялянства, што не адпавядала яго інтарэсам, партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва Беларусі не здолела дасягнуць гэтых мэт.

У перыяд з верасня 1953 г. па 1961 г. асаблівасцю аграрнай палітыкі савецкай дзяржавы быў паступовы адыход ад мабілізацыйна-прымусовых формаў арганізацыі і аплаты працы сялянства. Прыкметай такога адыходу стала адмена абавязковых паставак сельскагаспадарчых прадуктаў калгаснымі дварамі (1958 г.), паступовае ўкараненне ў калгасах і саўгасах гаспадарчага разліку, грашовай формы аплаты працы калгаснікаў.

У аснову вераснёўскага 1953 г. мадэрнізацыйнага праекту была пакладзена ідэя экстэнсіўнага шляху развіцця аграрнай вытворчасці. Практычным ўвасабленнем ідэі экстэнсіўнасці з'явілася асваенне цалінных і абложных зямель. У цэлым мерапрыемствы дзяржавы, якія пасля веранёўскага 1953 г. пленума ЦК КПСС укараняліся ў аграрную вытворчасць, дазволілі сельскай гаспадарцы БССР пераадолець наступствы вайны і нямецкай акупацыі. У развіцці сельскай гаспадаркі Беларусі былі дасягнуты пэўныя поспехі, зроблены вялікі крок наперад. Планавыя заданні сямігодкі сельская гаспадарка БССР практычна выканала.

У перыяд з 1962 г. па 1985 г. аграная палітыка савецкай дзяржавы была арыентавана на магутны ўздым сельскай гаспадаркі, поўнае задавальненне спажывецкага попыту на харчовыя тавары і патрэб сялянства, стварэнне перадавой сацыялістычнай сельскай гаспадаркі. Сакавіцкі 1965 г. мадэрнізацыйны праект, рэалізацыя асноўных палажэнняў гаспадарчай рэформы 1965 г. стымулявалі далейшае развіццё сельскай гаспадаркі Беларусі. У гэты час у мэтах забеспячэння інтарэсаў сялянства дзяржава спрабавала ўкараніць у вытворчасць эканамічныя формы арганізацыі і аплаты працы ў калгасах і саўгасах. Аднак ва ўмовах панавання каманднa-адміністрацыйнай сістэмы, уплыву фактара фармальна-бюракратычнага падыходу да іх укаранення і выкарыстання партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва Беларусі не здолела вырашыць гэтыя задачы.

Важным дасягненнем сельскай гаспадаркі Беларусі былі пэўныя поспехі ў раслінаводстве. Упершыню за ўсю гісторыю савецкіх пяцігодак ураджайнасць зерневых у калгасах і саўгасах БССР напрыканцы VIII пяцігодкі склала каля 17 ц/га, напрыканцы XII пяцігодкі – 29,5 ц/га. У межах агульнага народна-га-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

спадарчага комплекса Савецкага Саюза Беларусь выйшла на лідарскія пазіцыі па вытворчасці збожжа, чаго раней ніколі не было. У цэлым к канцу XII пяцігодкі аграпрамысловы комплекс БССР з'яўляўся адным з вядучых сектароў эканомікі народнай гаспадаркі СССР, а ў вытворчасці прадукцыі жывёлагадоўлі ў разліку на душу насельніцтва БССР ўвайшла ў лік сусветных лідараў. У 1971–1981 гг. палітыка магутнага ўздыма не была падмацавана ідэяй прыярытэту аграрнай вытворчасці. У гэтыя гады партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва СССР у вырашэнні харчовай праблемы павінна было праводзіць палітыку, накіраваную на павышэнне яе ролі ва ўмацаванні сацыяльнай стабільнасці і ўнутранай бяспекі дзяржавы. Але гэтага не было зроблена.

Аднак, нягледзячы на пралікі, у маі 1982 г. у СССР была рэальная магчымасць забяспечыць далейшае канкурэнтназдольнае развіццё сельскай гаспадаркі. Дзеля гэтага замест харчовай праграмы трэба было прыняць праграму прыярытэтнага развіцця сельскагаспадарчай вытворчасці, паскоранага завяршэння яе пераводу на індустрыяльны шлях развіцця, а затым – праграму пераводу АПК СССР на постіндустрыяльную аснову.

У 1943-1991 гг. камандна-адміністрацыйнай сістэме, якая склалася ў СССР і БССР, былі ўласцівы сацыяльна-пасіўныя, прымусова-загадныя формы і метады працы партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва СССР і БССР, якія былі пакладзены ў аснову яго практычнай дзейнасці. Яны былі заснаваны на прынцыпе: ад прыняцця дырэктыўных заданняў да арганізацыі іх выканання чалавекам працы. Гэтую дырэктыўную форму кіравання сельскай гаспадаркай неабходна было замяніць на сацыяльна-актыўныя формы і метады дзяржаўнага кіраўніцтва, якія былі б заснаваны на прынцыпе: ад вывучэння інтарэсаў і патрэб чалавека працы да іх рэалізацыі ў практычнай справе.

2. Перадваенная (старая) матэрыяльна-тэхнічная база сельскай гаспадаркі Беларусі за гады вайны і акупацыі была разбурана [4, с. 368–386; 5, с. 524–529]. Працэс развіцця новай матэрыяльна-тэхнічнай базы падзяляўся на чатыры этапы: этап аднаўлення часковага патэнцыялу старой матэрыяльна-тэхнічнай базы, які прыпаў на 1943-1953 гг., этап будаўніцтва новай матэрыяльна-тэхнічнай базы, які быў разгорнуты ў 1954–1961 гг.; этап яе далейшага развіцця, які ахапіў 1962–1985 гг, заключны этап у будаўніцтве новай матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі Беларусі, які прыпаў на 1986–1991 гг.

На працягу верасня 1943 – жніўня 1953 гг. адбывалася частковае аднаўленне матэрыяльна-тэхнічнай базы. У аднаўленчыя гады пачалося забеспячэнне сельскай гаспадаркі матэрыяльнымі, працоўнымі рэсурсамі, кіруючымі і прафесійнымі спецыялістамі, кадрамі масавых прафесій. Пасля здачы ў эксплуатацыю трактарных, аўтамабільных і іншых заводаў, МТС і саўгасы пачалі атрымліваць новую машынна-трактарную тэхніку. Этап будаўніцтва новай матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі прыйшоўся на 1954–1961 гг., яго вынікам з'явіўся пачатак пераводу аграрнай вытворчасці на індустрыяльны шлях развіцця. На гэтым этапе ў савецкай дзяржавы не было навукова распрацаванай канцэпцыі стварэння матэрыяльна-тэхнічнай базы аграрнай вытворчасці. У 1954–1961 гг. яе кіраўніцтва арыентавалася на практычныя патрэбы МТС, калгасаў і саўгасаў у будаўніцтве тэхналагічных памяшканняў, выкарыстанні машынна-трактарнай тэхнікі, электрыфікацыі і механізацыі аграрнай вытворчасці.

У 1962–1985 гг. на трэцім этапе ў савецкай дзяржавы з'явілася праграмная канцэпцыя далейшага развіцця матэрыяльна-тэхнічнай базы аграрнай вытворчасці. Партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва СССР і БССР арыентавалася на тэарэтычныя палажэнні, якія былі выкладзены ў трэцяй праграме КПСС, але не былі падмацаваны вопытам сацыяльнай апрабацыі. У працэсе практычнай апрабацыі асобных палажэнняў гэтай праграмы былі атрыманы станоўчыя вынікі. Перш за ўсё была праведзена поўная электрыфікацыя аграрнай вытворчасці і беларускай вёскі, зроблены пэўныя намаганні па пабудове жывёлагадоўчых памяшканняў, стварэнні тэхналагічнага комплексу калгасаў і саўгасаў, задавальненні попыту сельскай гаспадаркі на машынна-трактарную тэхніку. Працягваўся перавод аграрнай вытворчасці на індустрыяльную аснову. Забяспечаннасць калгасаў і саўгасаў працуючай аўтатрактарнай тэхнікай была даведзена да 75–80% ад нарматыўных патрэб.

На чацвёртым этапе ў 1986–1991 гг. прыкладваліся пэўныя намаганні па забеспячэнні калгасаў і саўгасаў машынна-трактарнай тэхнікай, узмацніўся працэс пераводу аграрнай вытворчасці на індустрыяльную аснову, але савецкая дзяржава не выканала свой абавязак па поўнаму задавальненні патрэб калгасаў і саўгасаў ў сучаснай машынна-трактарнай тэхніцы, іншых сродках вытворчасці. Таму задачу па завяршэнні будаўніцтва матэрыяльна-тэхнічнай базы сельскай гаспадаркі партыйна-дзяржаўнае кіраўніцтва СССР і БССР выканаць не здолела.

3. Асноўная роля ў кіраўніцтве калгасамі і саўгасамі належыла ніжэйшаму складу кіруючай эліты. Упраўленчы корпус аграрнай вытворчасці з'яўляўся складовай кіруючай эліты савецкай дзяржавы, быў яе ніжэйшым звяном. Палітыка-арганізацыйныя кампаніі, якія праводзіліся ў СССР і БССР па ўмацаванні калгасаў і саўгасаў кадрамі ўпраўленцаў, дапамаглі вырашыць праблему прафесійнай падрыхтоўкі ніжэйшага звяна эліты, але ў цэлым за перыяд з восені 1943 г. па 1991 г. савецкая дзяржава не здолела забяспечыць сельскую гаспадарку адказным, кваліфікаваным складам старшынь калгасаў і дырэктараў саўгасаў. У 1991 г. амаль 100% старшынь калгасаў і дырэктараў саўгасаў мелі неабходную вышэйшую адукацыю. У сваёй большасці ўпраўленчы корпус калгасаў і саўгасаў адпавядаў займаемай пасадзе, разам з тым, каля 6-8% старшынь калгасаў і дырэктараў саўгасаў па ўзроўню прафесійнай кампетэнцыі, арганізатарскіх здольнасцях не адпавядалі займаемай пасадзе. Злоўжыванне службовым становішчам (прыпіскі, ашуканства, крадзяжы грамадскай уласнасці) у асяроддзі кіраўнікоў, якія не адпавядалі займаемай пасадзе, былі звычайнай з'явай, што не дазволіла вырашыць задачу па забеспячэнні сельскай гаспадаркі адказным і кампетэнтным складам кіруючых кадраў.

4. Сістэма падрыхтоўкі дыпламаваных спецыялістаў, якая была створана ў рэспубліцы, патэнцыяльна магла задаволіць попыт калгасаў і саўгасаў на кваліфікаваныя кадры. Аднак фактар фармальна-бюрактарычнага падыходу да выкарыстання кадравага патэнцыялу, сацыяльныя ўмовы жыцця і працы спецыялістаў на вёсцы накладвалі негатыўны адбітак, не дазволілі у поўнай меры забяспечыць сельскую гаспадарку дыпламаванымі спецыялістамі. У сярэднім агульнае забеспячэнне сельскай гаспадаркі дыпламаванымі спецыялістамі складала каля 80-85% да нарматыўных патрэб.

5. У 1943–1991 гг. сістэма прафесійнай падрыхтоўкі механізатарскіх кадраў, створаная ў рэспубліцы, патэнцыяльна дазваляла забяспечыць аграрную вытворчасць неабходнай колькасцю спецыялістаў гэтага профілю. Партыйна-дзяржаўным кіраўніцтвам была праведзена пэўная арганізатарская работа па задавальненні патрэб калгасаў і саўгасаў у кадрах механізатараў. Аднак фактар фармальна-бюракратычнага падыходу да арганізацыі, аплаты працы механізатараў, іх замацавання за рабочым месцам ў гаспадарках не дазволіў вырашыць задачу поўнага забеспячэння патрэб калгасаў і саўгасаў ў гэтых спецыялістах. Забяспечанасць калгасаў і саўгасаў працуючай аўтатрактарнай тэхнікай, як і механізатарскімі кадрамі складала каля 75-80% да нарматыўных патрэб [6, с. 210–219].

ЛІТАРАТУРА


1. *Смяховіч, М. У.* Гістарыяграфія гісторыі сельскай гаспадаркі Беларусі: здабыткі і праблемы (1943–1991 гг.) / М. У. Смяховіч // Весці Нацыянальнай акадэміі Навук Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2016. – № 3. – С. 40–51;
2. *Смяховіч, М. У.* Сельская гаспадарка Беларусі ў 1943–1991 гг.: крыніцы даследавання / М. У. Смяховіч // Гістарычна-археалагічны зборнік. Вып. 31. – Мінск : Беларус. думка, 2016. – С. 175–186.
3. *Смяховіч, М. У.* Калектывізацыя ў заходніх абласцях БССР/ М. У. Смяховіч // Гістарычна-археалагічны зборнік. Вып. 31. – Мінск : Беларус. думка, 2016. С. 128–133.
4. *Смехович, Н. В.* Восстановление и модернизация сельского хозяйства в БССР (1944–1953 гг) / Н. В.Смеховіч // Восень 1939 года ў гістарычным лёсе Беларусі : матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 24 верас. 2009 г.) / рэдкал.: А. А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2010. – С. 368–386.
5. *Смяховіч, М. У.* На шляху да адбудовы сельскай гаспадаркі ў Савецкай Беларусі (верасень1943 г. – 1945 г.) / М.У. Смяховіч // Белорусь: памятное лето 1944 года : материалы Междунар. науч. конф., посвящ. 70-летию освобождения Беларуси от нем.-фашист. захватчиков (Минск, 19–20 июня 2014 г.) / Нац. акад. наук Беларуси, Мин-во обороны Респ. Беларусь ; редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск : Беларус. навука, 2015. – С. 524–529.
6. *Смяховіч, М. У.* Машынна-трактарныя станцыі ў СССР і БССР (1944–1958 гг.) / М. У. Смяховіч // Гістарычна-археалагічны зборнік. Вып. 30. – Мінск : Беларус. думка, 2015. – С. 210–219.


Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

7. *Смяховіч, М. У.*. Аплата працы ў калгасах і саўгасах БССР (1944–1985 гг.) / М. У. Смяховіч // Весці Нацыянальнай акадэміі Навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2015. – № 3. – С. 50–60.
8. *Смяховіч, М. У.* "Новая аграрная палітыка" ў СССР і яе асаблівасці ў БССР: асноўныя напрамкі (1986–1991 гг.) / М. У. Смяховіч // Весці Нацыянальнай акадэміі Навук Беларусі. Сер. гуманіт. навук. – 2014. – № 4. – С. 51–64.